*Сурба А.В. (Беларусь, г. Мінск)*

# РОЛЯ ДУДАРСКАЙ ТРАДЫЦЫІ Ў БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ КУЛЬТУРЫ

Пытанне дударскай традыцыі найбольш грунтоўна вывучалася навукоўцамі ў XIX ст. Такія даследчыкі, як Е. Раманаў, М. Нікіфароўскі, Н. Анімеле, П. Бяссонаў, Н. Прывалай, пакінулі сведчанні бытавання дуды ў вёсцы, мястэчку, горадзе на Беларусі [1].

Ці можна сцвярджаць пра феномен «дударскай традыцыі»? Для гэтага трэба разглядзець само паняцце «традыцыя». Традыцыя - гэта ўніверсальная форма захавання жыцця сацыяльнай арганізацыі, культуры, духоўных сіл чалавека. Інакш кажучы, традыцыя - гэта форма быцця духоўнага [2]. Яна фіксуе і захоўвае найстаражытнейшы першасны вопыт духоўна-практычнага асваення свету. Формамі традыцыі з'яўляюцца міфы, легенды, паданні, казкі, рытуалы, звычаі, ініцыяцыі. Сацыялагічна традыцыя ўспрымаецца як механізм сацыяльнага выбару інстытутаў і норм, які іх укараняе самім фактам іх прыналежнасці да традыцыі. Уласна кажучы, традыцыю можна трактаваць як перцэптуальную парадыгму, якая папаўняецца за кошт мастацтва і адначасова ўплывае на яго.

Для канстатацыі паняцця «дударская традыцыя» звернемся да тых крыніц, у якіх згадваецца бытаванне і выкарыстанне дуды ў розных сінкрэтычных праяўленнях.

1. Дуда як вобраз прысутнічае ў беларускіх легендах і паданнях. Напрыклад, цікавае паданне паведаміла Ганна Вянгура (в. Тонеж, Лельчыцкі раён): у ім расказваецца пра дудара, які прагнаў ваўкалака сваёй ігрой [3].

2. Вобраз дуды ў беларускіх песнях і прыказках. У адной з песень згадваецца каза і дзед, які хацеў пашыць дуду з жывёлы: *«Не бойся, козачка, стральцоў- малайцоў, а бойся дзеда старога, ён цябе забіе, шкуру злупя, дуду пайıя»* [1]. Вобраз дудара абыгрываецца і ў прыказцы: *«Сварыся з гаспадаром, толькі не бярыся з дударом»*.

3. Дуда ўжываецца ў традыцыйных беларускіх рытуалах. М. Нікіфароўскі неаднаразова згадвае пра ўдзел дудара на вяселлях, пахаваннях, хрэсьбінах [4]. І. Прывалаў прапаноўвае канцэпцыю дудароў-святароў, з яго пункту гледжання сучасныя дудары (пачатак XX ст.) уяўляюць рудыментарную форму язычніцкіх вераванняў і пераклікаюцца з культурай скамарохаў [5].

4. Выкарыстанне дуды ў святочных мерапрыемствах. М. Нікіфароўскі апісвае беларускія кірмашы. на якіх часта ігралі музыкі (скрыпакі) або дудары. Гэта быў неад'емны атрыбут святочных дзеянняў [4].

5. Наяўнасць каставага механізму перадачы майстэрства вырабу і выканання на дудзе. Да нас дайшлі сведчанні, што дударом мог стаць толькі сын дудара, якога навучаў бацька. Перадаваліся сакральныя веды майстравання дуды, а таксама выканальніцкай практыкі [4].

Такім чынам, «дударская традыцыя» ўключае такія сінкрэтычныя элементы, як музыка, выканальнік, фальклорны тэкст, танец, а таксама пэўнае канцэптуальнае вучэнне адносна прызначэння музычнага інструмента.

Дударская традыцыя з 2-й паловы XX ст. паступова пераходзіць з вёскі ў горад. Апошнім сведчаннем «жывой традыцыі», паводле І. Назінай, было выступленне дудара ў 1951 г. [1]. Аднак гэта не выключав магчымасці лакальных праяўленняў вясковай дударскай традыцыі. Напрыклад, Лепельскаму краязнаўчаму музею ў 1973 г. была перададзена дуда пасля таго, як памёр яе ўладальнік дзед- дудар. Неўзабаве прыкладна ў гэты ж час з'явіліся рамантычна настроеныя майстры (В. Жукоўскі, У. Гром, У. Пузыны. А. Лось) і даследчыкі (І. Назіна), якіх зацікавіла дуда. Тэма дуды пачала вывучацца на аснове

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

этнаграфічных звестак канца XIX - пачатку XX ст. У 1980-я гады былі здзейснены першыя экспедыцыі ў пошуках «жывога» дудара і яго інструмента. Але магчымасці таго часу не дазволілі знайсці такіх артэфактаў.

На пачатку і ў сярэдзіне 1990-х гадоў А. Лось і Т. Кашкурэвіч у адной з экспедыцый знайшлі рэшткі дуды - гэты час можна лічыць часам нараджэння неатрадыцыі. бо тады сфарміравалася суполка аматараў і навукоўцаў, якія асэнсавана вывучаюць традыцыю. іграюць, вырабляюць дуды.

Наступнае пакаленне майстроў з'явілася на мяжы 2004 - 2005 гг. Маладыя энтузіясты (А. Сурба, Д. Сухі. Ю. Панкевіч) удакладнілі тэхналогію вырабу дуд, мадэрнізавалі інструментарый, а таксама пачалі актыўна прапагандаваць вывучэнне дударскай традыцыі і такім чынам заклалі моцны фундамент у фарміраванне і развіццё дударскай неатрадыцыі.

Атрыбутыўнай якасцю новай дударскай традыцыі з'яўляецца яе культаванне і развіццё ў межах горада. што стала для многіх аматараў не проста культурным феноменам, а пэўнай субкультурай. Далейшае развіццё неатрадыцыі ў межах гэтай субкультуры прыводзіць да фарміравання неафальклору з характэным постмадэрністычным уплывам і плюралізмам музычных форм. Канцэптуальны падыход да вывучэння гэтага феномену прыводзіць музыкаў да постфальклору. Такім чынам, можна правесці дэфініцыю неафальклору і постфальклору (мал.1).



Малюнак 1.

На сучасным этапе дамінуюць постфальклорныя музычныя формы, што сведчыць пра канцэптуальнае дамінаванне мыслення над перцэптуальным (неафальклор). Аднак нараджэнне дударскай неатрадыцыі пакуль што не стварыла паўнавартасную канцэпцыю для далейшага самаразгортвання і самаразвіцця, гаму назіраецца перайманне некаторых элементаў дударскай традыцыі. Напрыклад, майстар І музыка А. Лось пакінуў мяжу горада Мінска і пасяліўся на хутары Барок Валожынкскага раёна. У гэтай ціхай і спакойнай мясцовасці пасярод лесу ён займаецца жывапісам, графікай, музыкай і вырабам старадаўніх інструментаў. Сярод яго прац ёсць і дуды. А. Лось арганізаваў на сваім хутары афасядзібу і займаецца экатурызмам. Многія аматары культурнага адпачынку з Беларусі і замежжа прыязджаюць да майстра, каб атрымаць асалоду ад некранутай прыроды, паназіраць за творчым працэсам стварэння музычных інструментаў, а таксама пачуць першыя гукі толькі што настроенай дуды. У апошняе дзесяцігоддзе на хутар Барок раз у год пачалі з'язджацца аматары неадударскай і постдударскай традыцыі, зрабіўшы яго

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

месцам паломіцтва для тых, хто лічыць дуду сэнсам жыцця. Прыклад А. Лася пераняло малодшае пакаленне: Т. Кашкурэвіч, Ю. Панкевіч, З. Сасноўскі, А. Прысмакоў.

На сённяшні дзень цяжка сказаць, ці магчыма аднавіць дударскую класічную традыцыю, але можна канстатаваць факт нараджэння неатрадыцыі і посттрадыцыі. Ці адбыліся пры гэтым кардынальныя змены, пакажа час. Але становіцца відавочным, што дударская традыцыя не памірае: яна мадыфікуецца ў неадударскую і постдударскую формы з пастаянным зваротам да традыцыі. У некаторых выпадках яна прымае форму субкультуры, але ў асноўным імкнецца пераняць асноўныя палажэнні традыцыі, а таксама ўзбагаціць іх, надаць новы каларыт, мадэрнізаваць і ўкараніць у сучасным мастацтве Беларусі. Дамінуючымі з'яўляюцца посттрадыцыйныя формы, а неатрадыцыйныя - у рэцэсіўным становішчы. З нашага пункту гледжання, неабходна развіццё неатрадыцыі, бо гэта адзін з галоўных
фактараў узбагачэння перцэптуальнай парадыгмы, якая спрыяе развіццю новых мастацкіх вобразаў і фарміраванню нацыянальнага каларыту.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Назіна, І.Д. Беларускія народныя музычныя інсгрументы / І.Д. Назіна - Мінск, 1997. -239 с.
2. Философский словарь / А.П. Алексеев [и др.]; под ред. А.П. Алексеева - М., 2009. - 437 с.
3. Беларуси / рэдкал.: М.Ф. Піліпенка [і інш.]. - Мінск : Беларуская навука, 2008 - Т. 11 / Т.Б. Варфаламеева [і інш.]. - 700 с.
4. Никифоровский, Н.Я. Очерки Витебской Белоруссии. Дудар и Музыка / Н.Я. Никифоровский // Этнографическое обозрение. - Витебск, 1892. - Кн. 13 - 14, № 2 - 3. - 33 с.
5. Прывалаў, Н. Беларускія народныя інструменты / Н. Прывалаў. - Мінск, 1928. - 37 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ